Алена Касінская
Зоя Пятроўская

# Рэха Чарнобыля:

## інфармацыя аб катастрофе стагоддзя ў базе даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі




Чарнобыльская катастрофа – найбуйнейшая з тэхнагенных катастроф нашага часу. Яна паставіла перад чалавецтвам праблемы, якія закранаюць усе сферы жыцця, не ведаюць ні тэрытарыяльных, ні часавых межаў. Гэта – радыяцыйныя, медыка-біялагічныя, экалагічныя, сацыяльна-эканамічныя, сацыяльна-псіхалагічныя праблемы. Да таго ж з кожным годам выяўляюцца ўсё новыя межы трагедыі.

Для Беларусі чарнобыльская катастрофа стала нацыянальным бедствам на доўгія гады. Зямля значнай часткі нашай краіны забруджана доўгажывучымі радыенуклідамі. Нельга карыстацца дарамі лесу, сеяць і вырошчваць ураджай. Уздзеянне радыяцыйнай аварыі адбіваецца на здароўі ўсёй нацыі, на яе генафондзе, ставіць пад пагрозу будучае нашай краіны. Расце колькасць захворванняў людзей, смяротнасць, зніжаецца нараджальнасць. Асаблівую значнасць набывае праблема вызначэння вынікаў уздзеяння на жывы арганізм малых доз знешняга і ўнутранага апрамянення. Перад насельніцтвам Беларусі паўстала пытанне рэальнага выжывання ў існуючых умовах.



# РЭХА ЧАРНОБЫЛЯ: база даных НББ




Нягледзячы на тое, што пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі прайшоў значны час, грамадскасць усведамляе неабходнасць вывучэння гэтай глабальнай катастрофы ўсё ў большай ступені. Для нашай краіны праблемы адукацыі і асветы ў галіне радыяцыйнай бяспекі, радыебіялогіі і радыеэкалогіі, якія абумоўлены асаблівым цяжарам вынікаў катастрофы, маюць дзяржаўную значнасць, з'яўляюцца адной з састаўляючых сістэмы жыццезабеспячэння і рэабілітацыі дзяцей і моладзі, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

Дапамагаць у вывучэнні і вырашэнні чарнобыльскіх праблем прызначаны і базы даных чарнобыльскай тэматыкі. Адна з іх – «Чарнобыль» – генерыруецца з 1993 года ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

База даных «Чарнобыль» прызначана для інфармавання спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі аб дакументах па ўсіх аспектах чарнобыльскай катастрофы і мінімізацыі яе вынікаў, для азнаямлення насельніцтва раёнаў, якія пацярпелі ад катастрофы, з матэрыяламі пра радыяцыю і абарону ад яе.

У стварэнні базы даных прымаюць удзел буйнейшыя бібліятэкі Беларусі: Нацыянальная бібліятэка, Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка, Рэспубліканская навуковая сельскагаспадарчая бібліятэка, Навукова-педагагічная бібліятэка навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка.

Зараз існуе шэраг інфармацыйных крыніц, прысвечаных чарнобыльскім праблемам: база даных і бягучы паказальнік «Медико-биологические аспекты аварии на Чернобыльской АЭС» Беларускага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматыкі, кіравання і эканомікі аховы здароўя Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь; база даных і паказальнік «Природа Беларуси» Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якая ўключае звесткі аб дакументах чарнобыльскай тэматыкі; заканадаўчая поўнатэкставая база даных «КансультантПлюс» Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым база даных «Чарнобыль» найбольш поўна ўключае дакументы па пытаннях, якія датычацца грамадскіх і гуманітарных навук (сацыялогія, статыстыка, дэмаграфія, эканоміка, дзяржава і права, мастацкая літаратура і літаратуразнаўства, мастацтва і мастацтвазнаўства, рэлігія,

псіхалогія). Прыродазнаўчы, сельскагаспадарчы, медыцынскі і тэхнічны аспекты прадстаўлены ў асноўным літаратурай па агульных пытаннях, арганізацыйных праблемах, а таксама звесткамі аб публікацыях аналітычнага і падагульняючага характару. Па-за межамі базы даных застаюцца спецыяльныя навуковыя працы, якія датычацца гэтых галін ведаў.

БД «Чарнобыль» уключае дакументы, выдадзеныя ў 1991–2000 гг. незалежна ад мовы, месца выдання, носьбітаў інфармацыі: кнігі (манаграфіі, зборнікі, даведачныя і статыстычныя выданні, тэзісы дакладаў, матэрыялы канферэнцый, сімпозіумаў), аўтарэфераты дысертацый, дысертацыі (з 1994 г. выдання); рэцэнзіі; главы і раздзелы з кніг, зборнікаў; перыядычныя выданні чарнобыльскай тэматыкі і артыкулы з іх (да 1995 г. – усіх газет, таксама беларускіх раённых); картаграфічныя выданні; ноты; творы выяўленчага мастацтва; машыначытаемыя носьбіты інфармацыі.

БД «Чарнобыль» уключае дакументы аб забруджаных прасторах Беларусі, Расіі, Украіны, іншых тэрыторыях былога СССР і замежных краін, якія адчулі ўздзеянне чарнобыльскай катастрофы, а таксама аб тэрыторыях, якія падвергліся ядзерным катастрофам, падобным да чарнобыльскай.

Матэрыялы, змешчаныя ў базе даных, павінны зацікавіць кіраўнікоў дзяржаўных і гаспадарчых арганізацый, спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі. Для іх будуць карыснымі дакументы па пытаннях наступстваў катастрофы і іх мінімізацыі, у прыватнасці, медыцынскіх, сацыяльна-эканамічных; радыяцыйным становішчы ў канкрэтных раёнах; сацыяльна-эканамічным становішчы зоны павышанай радыяцыі; па пытаннях аздараўлення насельніцтва; заканадаўчыя дакументы, нарматыўныя акты Міністэрстваў і ведамстваў па чарнобыльскіх пытаннях і каментарыі спецыялістаў да іх. Кіраўнікоў грамадскіх арганізацый зацікавяць дакументы аб чарнобыльскіх арганізацыях і іх дзейнасці ў Беларусі і іншых краінах свету, аб дзейнасці міжнародных арганізацый па вырашэнню чарнобыльскіх праблем. Працаўнікі сельскай гаспадаркі знойдуць матэрыялы аб утрыманні радыенуклідаў у сельскагаспадарчай прадукцыі, грыбах, ягадах, пітной вадзе канкрэтных рэгіёнаў, а таксама парады па вядзенню раслінаводства, жывёлагадоўлі, лясной гаспадаркі на забруджаных тэрыторыях. Жыхары забруджаных тэрыторый зацікавяцца агульнымі звесткамі аб радыяцыі, яе ўздзеянні на арганізм чалавека, парадамі па ачышчэнню прадуктаў харчавання, па ўтрыманню хатняй жывёлы, працы на прысядзібным участку, выкарыстанні дароў лесу ва ўмовах радыяцыйнага забруджання. Для спажыўцоў таксама будзе карыснай інфармацыя пра дакументы па сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы.

Бібліяграфічнае апісанне дакументаў складаецца на мове тэксту выдання ў адпаведнасці з ДАСТам 7.1-84 «Библиографическое описание документа. Общие требования и правила составления». Бібліяграфічны запіс на замежных мовах суправаджаецца анатацыяй на беларускай мове. Пры неабходнасці анатацыі ўдакладняюць назвы публікацый, час і месца дзеяння, прозвішчы ўдзельнікаў падзей. У бібліяграфічных запісах прымяняюцца скарачэнні слоў і словазлучэнняў у адпаведнасці з СТБ 7.12-95 «Бібліяграфічны запіс. Скарачэнне слоў і словазлучэнняў на беларускай мове», ДАСТам 7.12-93 «Библиографическая запись. Сокращение слов на русском языке», ДАСТам 7.11-78 «Сокращение слов и словосочетаний на иностранных европейских языках в библиографическом описании».

База даных уключае дакументы на розных мовах (беларускай, рускай, украінскай, польскай, балгарскай, англійскай, нямецкай, французскай і іншых).

Пошук вядзецца па наступных слоўніках: інвентарны нумар, аўтар, загаловак выдання ці яго часткі, персаналіі, ключавыя словы, серыя выдання, геаграфічны вызначальнік, часткова – ДАСНТІ, УДК.

База даных мае друкаваны аналаг: бібліяграфічны паказальнік «Чарнобыль» за 1991, 1992, 1993, 1994, 1995–1997, 1998–2000 гады. Бібліяграфічныя запісы ў паказальніку групуюцца па спецыяльна распрацаванай схеме. У раздзелах літаратура размешчана ў алфавітным парадку прозвішчаў аўтараў ці назваў твораў, асобна кірылічным і лацінскім шрыфтамі. У канцы раздзелаў выдзелены бібліяграфічныя дапаможнікі. Астэрыскам (*) адзначаны публікацыі, не прагледжаныя de visu. Дакументы, якія ёсць у Нацыянальнай бібліятэцы, даюцца з інвентарнымі нумарамі. Сувязь матэрыялаў розных раздзелаў і падраздзелаў паказана пры дапамозе сістэмы адсылак. Выданне забяспечана імянным і геаграфічным дапаможнымі паказальнікамі, а таксама паказальнікамі матэрыялаў з'ездаў, канферэнцый, кангрэсаў, пасяджэнняў, сімпозіумаў, семінараў, бібліяграфічных крыніц; баз даных; назваў кніг, апісаных пад загалоўкам і перыядычных выданняў. Змест і прадмова даюцца паралельна на беларускай і англійскай мовах.